# САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ, ВЫНЕСЕНАЙ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ Ў 9 КЛАСЕ УСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

**Кавалюк А.С.**

Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна

**Анатацыя.** У артыкуле актуалізуецца праблема сацыякультурнага развіцця моладзі, аналізуюцца паэтычныя творы, вынесеныя для вывучэння ў 9 класе школьнага курса літаратуры.

**Ключавыя словы:** лірычны герой, пачуццё гонару, сацыяльныя і агульначалавечыя матывы, культурныя і духоўныя каштоўнасці.

У сучасным жыцці надзвычай актуальнай з’яўляецца праблема сацыякультурнага развіцця моладзі як працэсу выхавання сацыяльназначных асабістых якасцей (мэтанакіраванасці, самастойнасці ў прыняцці рашэнняў, камунікабельнасці, грамадзянскай адказнасці, свядомасці, гуманнасці, духоўнасці і інш.), у ходзе якога адбываецца набыццё вучнямі ведаў аб сацыяльных нормах і культурных каштоўнасцях; прыняцце каштоўнасных установак у адносінах да сябе, працы, грамадства, ведаў, іншых людзей; фарміраванне камунікатыўна-паводзінавых навыкаў на аснове ўзаемапавагі, супрацоўніцтва.

Паэма “Песня пра зубра” М. Гусоўскага дае ўяўленне аб сацыяльных і міжасабовых адносінах беларусаў XVI ст., аб самарэалізацыі асобы пад час палявання на зубра. Невыпадкова князь Вітаўт, рыхтуючы ваяроў-абаронцаў радзімы, выпрабоўваў іх на гэтым паляванні. Паэт-гуманіст фарміруе ў чытача пачуццё гонару за продкаў і сваю краіну, якія ніколі не нападалі першымі, але ўмелі бараніцца ад ворагаў. Сваёй лацінамоўнай паэмай М. Гусоўскі знаёміў

еўрапейскага чытача з дарагой яго сэрцу радзімай, менталітэтам, звычаямі і традыцыямі яе жыхароў. У паэме “Тарас на Парнасе” К. Вераніцын засяроджваецца на выяўленні лепшых рысаў беларускага мужыка, яго кемлівасці, абачлівасці, дасціпнасці, валодання пачуццём гумару. Лепшыя чалавечыя якасці, здольнасць адстаяць пачуццё жаночай годнасці паэтызуе Янка Купала ў паэме “Бандароўна”. “Новая зямля” Якуба Коласа, па праву, лічыцца энцыклапедыяй беларускага сялянства мяжы XIX–XX стст. У паэме “Люцыян Таполя” Максім Танк адстойвае права мастака-творцы на свабоду творчасці. Паэма-рэквіем “Голас сэрца” П. Броўкі ўвекавечвае подзвіг змагароў з фашызмам і памяць пра бязвінных ахвяр генацыду падчас Другой сусветнай вайны. Ва ўсіх творах сацыяльныя матывы спалучаюцца з агульначалавечымі.

У вершы “Мая дудка” Ф. Багушэвіч уздымае праблему служэння мастака слова свайму народу, выяўлення ім сацыяльнай несправядлівасці. У вершы “Хмаркі” паэт закранае праблему “тутэйшасці” і “бяздомнасці” тых, хто адарваўся ад “ зямлі родненькай”.

Верш Янкі Купалы “Мая малітва” – паэтава маленне за родную зямлю і яе насельнікаў, каб над імі больш не шалелі “чорныя долі з мяцеліцаў шумамі”. Пачуццё гонару за свой пакрыўджаны народ, які захацеў “людзьмі звацца” перапаўняе аўтара верша “А хто там ідзе?”. Гімнам роднай мове, пакрыўджанай, гнанай, беднай, але жывой, бясмертнай, свабоднай успрымаецца Купалаў верш “Роднае слова”. У творах асэнсаваецца гістарычны лёс беларускага народа. Да агульначалавечых матываў вечнасці жыцця, кахання, гармоніі чалавека і прыроды, паэтызацыі чалавека працы звярнуўся паэт у вершах “Явар і каліна” і “Жняя”.

Верай лірычнага героя ў лепшы дзень роднай старонкі прасякнуты верш Якуба Коласа “Не бядуй!”. Паэтава прыкаванасць да “вобразаў мілых роднага краю” паэтызуюцца ў вершы “Родныя вобразы”. “Першы гром” – твор, у якім услаўляецца веліч прыроднай стыхіі і выяўляецца жаданне такога ж абуджэння ў грамадскім жыцці.

“Санет” (“Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...”) М. Багдановіча – гэта выражэнне веры ў адраджэнне роднага краю. Агульначалавечыя матывы, багацце духоўнага свету лірычнага героя выяўлены паэтам у вершах “Маладыя гады”, “Жывеш не вечна, чалавек”. М. Багдановіч заклікае маладых жыць і цэльнасці шукаць, аб шыраце духоўнай дбаць. Гармонія чалавека і прыроды пануе ў вершы “Плакала лета, зямлю пакідаючы...”. Праблему прызначэння паэзіі як будзіцеля “святога сумлення” закранае М. Багдановіч у вершы “Песняру”. Да духоўных традыцый свайго народа далучае чытача паэт у вершы “Кніга”, прэзентуючы Псалтыр як адну з найвялікшых духоўных каштоўнасцей роднай зямлі. Лірычны герой імкнецца спазнаць не толькі знешнюю прыгажосць незвычайнай кнігі, але і спасцігнуць яе ўнутраную прыгажосць, здольную даць радасць душы. Матыў далучэння нашчадкаў да духоўнага вопыту продкаў вызначае верш “Летапісец”. Ідэі сацыяльнай несправядлівасці, еднасці людской маюць месца ў вершы “Мяжы”. Глыбока філасофская думка еднасці людской, мірнага суіснавання ў свеце гучыць у вершы “Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы…”

Грамадзянскім пафасам прасякнуты вершы Цёткі “Мае думкі”, “Вера беларуса”, “Мора”. Лірычная гераіня імкнецца “думаць ўсюды аб народзе, / Родны край усюды сніць”. Яна верыць, што суайчыннікі-беларусы стануць вольнымі людзьмі, заклікае іх змагацца за свае сацыяльныя правы.

Алесь Гарун у вершы “Ты, мой брат, каго зваць Беларусам...” заклікае “роднай мовы сваёй не цурацца”. Паэт верыць, што “за пашану радзімаму слову / Ушануюць нас брацця-народы!” Пытаннямі аб сэнсе чалавечага жыцця задаецца лірычны герой верша “Ідуць гады”. Узяўшы за Настаўніка свет прыроды, ён вывеў аксіёму сваёй прысутнасці ў свеце: “Прысуджаны шлях свой рабі дарагім, / Красуйся на радасць сабе і другім”.

У. Дубоўка ў вершы “О Беларусь, мая шыпшына” прызнаецца ў любові сваёй радзіме, прадказвае ўласны драматычны лёс (“на дзіды сэрца накалю”) і лёс радзімы (“чарнобылем не зарасцеш”). Паэт сцвярджае, што “ў перашкодах дух расце”. Прадчуваннем драматычнага шляху прасякнуты і верш “Залатая асенняя раніца…”. Яго лірычны герой разумее, што “лёс для ўсіх не бывае аднакавы”, у прадчуванні ростані ён развітваецца з любымі сэрцу краявідамі. Верш “Родная мова, цудоўная мова!” – гэта гімн матчынай мове і вера ў яе бясмерце.

Верш А. Куляшова “Мая Бесядзь” вучыць маладых мэтанакіраванасці, упартасці ў дасягненні пастаўленай мэты, імкненню капаць “рэчышча ўласнай ракі”. Паэт не зычыць нікому спакойнага шчасця, па яго перакананні, жыццё павінна быць дзейсным. Лірычны герой верша “На паўмільярдным кіламетры” А. Куляшова ўспрымае сябе паміж наступным і былым, раіць адносіцца да жыцця па-філасофску.

Філасофскі роздум пра чалавека, яго жыццёвае прызначэнне, увага да духоўнага свету чалавека, агульначалавечых каштоўнасцей характэрны для вершаў МаксімаТанка “Мой хлеб надзённы”, “Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...”, “Не знаю...”. Неспакой за родную зямлю перапаўняе сэрца лірычнага героя верша “Мой хлеб надзённы”.

Глыбока павучальны верлібр "Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...", у якім паэт пераконвае: "толькі тады становішся чалавекам, калі ўсе могуць спадзявацца на цябе".

Лірыка П. Броўкі, А. Куляшова, Максіма Танка, П. Панчанкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны прасякнута патрыятычным і грамадзянскім пафасам. Выяўленнем палымянай веры ў перамогу вызначаецца верш П. Броўкі "Спатканне". Лірычны герой гатовы помсціць за абвугленую радзіму. Балады А. Куляшова "Над брацкай магілай" і П. Панчанкі "Герой" – гэта рэквіем па змарнаваным вайной маладым жыццям, ушанаванне подзвігу змагароў з фашызмам. Нязломная духоўная сіла беларускага народа, яго веліч і непераможнасць, жывучасць роднай мовы сцвярджаюцца ў вершы Максіма Танка "Родная мова". Праніклівым духоўным запаветам, маральным імператывам кожнаму чалавеку з'яўляецца твор П. Панчанкі "Той дзень прапаў і страчаны навекі…" Яго на памяць павінен ведаць кожны школьнік. Вершам "Крык сойкі" паэт актуалізуе праблему гарманічнага суіснавання чалавека і прыроды.

"Ты пакліч мяне. Пазаві..." Я. Янішчыц, "Завушніцы" Максіма Танка, "Спарышы" П. Панчанкі – лепшыя ўзоры беларускай любоўнай лірыкі.

Прапанаваныя вучням 9-х класаў паэтычныя творы беларускіх паэтаў, напісаныя ў розныя перыяды развіцця літаратуры, спрыяюць сацыякультурнаму развіццю моладзі, выхоўваюць сацыяльназначныя асабістыя якасці, папаўняюць веды аб сацыяльных нормах і культурных каштоўнасцях, фарміруюць аксіялагічныя ўстаноўкі ў адносінах да сябе і іншых, спрыяюць удасканаленню і самарэалізацыі асобы.